Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

UDK 27–1:929Trubar P.

Ihar Klimau
Minsk

ТЭХНІКА БІБЛЕЙНАГА ПЕРАКЛАДУ ПРЫМАЖА ТРУБАРА (НА ПРЫКЛАДЗЕ АНАЛІЗУ МЦ. 13:1–23; МК. 4:1–20, 23).

Na podlagi vzporednih odlomkov iz evangelija pripevek analizira sintaktično in gramatično strukturo (besedni red in prenos posebnih gramatičnih oblik in idiomov originala) Trubarjevega prevoda iz leta 1557, njegove rešitve glede izbora besedja in glede kalkiranja ter tudi stabilnost v prevajanju istih leksemov na različnih mestih besedila.

On the example of parallel excerpts from a Gospel, the author analyzes the syntactic and grammatical structure (word order and rendering of particular grammatical forms and idioms from the original) in Primož Trubar's translation of 1557, his approach to the choice of lexicon and calqüs, as well as the consistency in translation of the same lexical items in various places in the text.

Ključne besede: Trubarjev prevod, izbor besedja, stabilnost v prevajanju

Key words: Primož Trubar's translation, choice of lexicon, consistency in translation

0 Біблейны пераклад Прымажа Трубара быў адным з першых у славянскай Рэфармацыі наогул і першы ў Славеніі. Менавіта Трубар запачаткаваў у сябе на радзіме літаратурную традыцыю, як і практыку перакладу Св. Пісьма (Seitz 1998: 38–47).

Назіранні над тэхнікай перакладу Трубара ў дадзенай працы праводзіліся на матэрыяле невялікіх урыўкаў з Евангелля (прыпавесць пра сейбіта і яе тлумачэнне, з некаторымі ўступнымі і прамежкавымі пасажамі), якія паўтараюцца ў Мц. і Мк. (далей гэтыя індэксы перад лічбай раздзела не ставяцца). Увага была сканцэнтравана на ТТ 1557, як спарадычна параўноўваўся з ТЕ 1555 і ТТ 1581–82[1] а таксама ў ілюстрацыйных мэтах – з DB. Лацінская версія прадстаўлена Vg і перакладам Эразма Ратэрдамскага 1516–35 гг. паводле выдання 1542 г. (EB)[2], нямецкая – перакладам Марціна Лютара (LB 1546).

1 Арыгінал і прынцып перакладу

Асноўным арыгіналам П. Трубару паслужыў нямецкі пераклад М. Лютара, што стасавальна Евангелляў было даўно высветлена ў навуцы (Grafenaür 1914: 298–303; Rozman 1986: 227–240). Трубар дастаткова добра ведаў нямецкую мову і, верагодна, рэпрэзентаваў білінгвальныя (нямецка-славенскія) мяшчанскія асяродкі

[1] Пры супадзенні чытання Вульгаты з перакладам Эразма прыклад цытуецца паводле апошняй крыніцы.

[2] Аднак пры гэтым свае пераклады ён адрасаваў хутчэй за ўсё аднамоўным славенцам, перш за ўсё сялянам, якія нямецкай мовы не ведалі (Ilešič 1908: XXV, XX; Seitz 1998: 247).

Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

сваёй радзімы (Seitz 1998: 205–220).[3] Пераклад Лютара для яго славенскіх адэптаў безумоўна меў статус першакрыніцы.

Сярод іншых крыніц працы Трубара даўно ўказваліся і іншыя пераклады: Вульгата (Grafenaür 1914: 298–299; Breznik 1917: 170), лацінскі пераклад Эразма Ратэрдамскага (Grafenaür 1914: 299; Ahačič 2007: 271–272, 273–274) і некаторыя іншыя. Аналіз урыўкаў паказаў, што ў многіх выпадках Трубар спарадычна выкарыстоўваў у якасці дадатковага лацінскі пераклад: Вульгату і/ці Эразма, апошні ўлічваў некаторыя чытанні грэчаскага тэксту, адсутныя ў Вульгаце (і часткова праігнараваныя Лютарам).

1.1 Выкарыстанне лацінскага перакладу праяўляецца праз спарадычнае ўвядзенне яго чытанняў у Лютарава атачэнне (асабліва адметнае ў Мк.). Зрэдку можна заўважыць, што Трубар выкарыстоўваў не толькі Вульгату, але і пераклад Эразма. Відаць, Трубар імкнуўся не столькі наблізіцца да грэчаскага тэксту (праз Эразмавы пераклад), колькі захаваць некаторыя чытанні Вульгаты, адкінутыя Лютарам.[4]

1.1.1 У пасажы Мк. 4:1 *auff dem waſſer ſitzen – ie na* ***moriu*** *ſedel* (Vg, EB: *ſederet in mari*) звяртае ўвагу не толькі пераклад *morie* замест чаканага *voda* (як у DB), але і выкарыстанне формы мінулага часу ў адпаведнасці з лацінскім тэкстам. У грэчаскім тэксце тут выступае абсалютыўная канструкцыя, якую Лютар перадаў праз мадальны дзеяслоў з двума прэдыкатыўнымі інфітывамі: *er* ***muſte*** *in ein Schiff* ***tretten****, und auff dem waſſer* ***ſitzen***, што дакладна перадаў Далмацін: *je on moral v'en Zholn ſtopiti, inu na vodi ſedèti*.

1.1.2 Пад лацінскім уплывам зроблены пераклад пасажу ў 4:18: ***ty ſo, kir*** *poslushaio to beſſedo* – Vg, EB ***hi ſunt, qui*** *ſermonem* (Vg *verbum*) *aud(er)iunt*, параўн.: LB 1546 ***Die*** *das wort hören* – DB ***kateri*** *to Beſsedo poſluſhajo*. Аднак аналагічная канструкцыя крыху ніжэй перакладаецца ўжо інакш: ***Die*** *das wort hören* – ***ty*** *poslushaio to beſſedo* 4:20 (Vg, EB ***qui*** *audiunt ſermonem* / Vg *verbum*). Невялікія прыхіленні да лацінскага перакладу адзначаюцца ў 4:11: *Denen aber drauſſen wiederferet es alles durch Gleichniſſe – anpag teim* ***kir ſo*** *isuuna, vſe rizhi ſe gode skuſi perglihe*. У 1-й частцы гэтага пасажу Трубар яўна выкарыстоўвае лацінскі тэкст: Vg, EB *illis autem* ***qui*** *foris* ***ſunt****, per parabolas* (Vg: *parabolis*) *omnia ſunt*, тут нават Далмацін не трымаецца літаральна Лютара і паслядоўнічае Трубару: *tém pak, kateri ſo svunaj, ſe vſe gody ſkusi priglihe*.

У шэрагу ідэом Трубар таксама выразна перакладае паводле лацінскага тэксту насуперак Лютару: *mit ſehenden Augen, ſehen ſie nicht, vnd mit hörenden Ohren, hören ſie nicht – oni uideozh ne uide, inu poslushaiozh ne slishio* 13:13 (таксама яшчэ ў TE 1555), параўн.: Vg, EB *quia videntes non vident, & audientes non audiunt*; *Auff*

[3] Аднак пры гэтым свае пераклады ён адрасаваў хутчэй за ўсё аднамоўным славенцам, перш за ўсё сялянам, якія нямецкай мовы не ведалі (Ilešič 1908: XXV, XX; Seitz 1998: 247).

[4] Дробныя выпадкі ўплыву лацінскага тэксту (на ўзроўні слова ці словаформы) разгледжаны ніжэй (гл.: 1.3.1, 3.1–3.3, 4.1, 5.2.1, 5.2.2, 5.3), зараз жа разглядаюцца выпадкі сінтаксічнага ці тэксталагічнага ўздзеяння.

Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

das ſie es mit ſehenden augen ſehen, und doch nicht erkennen, und mit hörenden ohren hören und doch nicht verſtehen – de uideozh uidio, inu ne ugledaio, inu poslushaiozh posluſhaio, inu ne ſaſtopio 4:12, параўн.: Vg, EB *Ut videntes videant & non cernant* (Vg *non videant*)*: & audientes audiant, & non intelligent*.

1.1.3 Пра звяртанне Трубара да Вульгаты сведчыць даданне прыслоўя напачатку фразы ў 13:11: ***Sakai*** *uom ie danu*, параўн.: Vg ***Quia*** *vobis est datum*, тады як LB 1546 *Euch iſts gegeben* паводле EB: *Vobis datum eſt* (таксама TE 1555 *Vom ie danu*, гл. 6.1).

1.1.4 Паказальны выпадак, які сведчыць пра выкарыстанне Трубарам перакладу Эразма, дае пасаж у 4:20: ***taku, de*** *enu* ***ſeime pernesſe*** *trideſſet…* – ***itaut*** *aliud* ***granumadferat*** *triginta…* (вылучаныя словы дададзены ў пераклад Эразмам), Vg *unum triginta…*, параўн.: LB 1546 *etlicher dreiſſigfeltig…* – DB *nekateru ſamotrideſset…*

1.1.5 У некаторых выпадках выкарыстанне лацінскага перакладу выглядае сумнеўна: *Er antwortet, und ſprach – On odgouori inu praui* ***knim*** 13:11, параўн.: Vg *Qui responens ait* ***illis***, EB *At* ***ille*** *reſpondens dixit eis*. Відаць, кантамінацыю нямецкага і лацінскага перакладаў уяўляе сабой наступны выпадак 4:18: *Inu* ***eni drugi*** *ſo* (DB *Inu lety ſo*), параўн.: LB 1546 *Vnd* ***dieſe*** *ſinds*, Vg, EB *Et* ***alii*** *ſunt*. Самастойную навацыю Трубара або выкарыстанне нейкага іншага перакладу ўяўляе сабой пасаж 4:20: *inu* ***to iſto gori vſameio***, параўн.: LB 1546 *vnd* ***nemens an***, DB *inu jo gori vsameo*, Vg, EB *& ſuſcipiunt*.

1.2 Асноўны прынцып перакладу Трубара – паслоўны, г. зн., што ён перакладаў нямецкі арыгінал слова ў слова, у тыповым выпадку падаючы да аднаго слова (у т. л. да граматычнага слова – артыкля) арыгіналу аднаслоўны эквівалент у перакладзе. Напрыклад: *Vnd er ſprach zu jnen, Euch iſts gegeben das Geheimnis des reichs Gottes zu wiſſen – Inu on praui knim, Võ ie danu üiditi to skriunuſt tiga Bohsyga* [!] *kraleuſtua* 4:11. Асабліва паказальна выкарыстанне ў славенскім перакладзе «артыкляў», ролю якіх выконваюць звычайна ўказальныя займеннікі. Гэтыя рысы сінтаксіса Трубара былі адзначаныя ўжо даўно (Kopitar 1808: 54–55; Breznik 1917: 173; Koruza 1984: 107–113; Toporišič 1987: 9–13; Seitz 1998: 64–120), што, натуральна, указвае на нямецкі тэкст як асноўны ўзор перакладу.

1.3 Аднак паслоўны прынцып, выкарыстаны Трубарам, мае шэраг выразных выключэнняў, абумоўленых або граматычным адрозненнем нямецкай і славенскай моў (такія з'явы больш паслядоўныя, гл. 1.3.1–3, 1.3.6), або стылістычнай стратэгіяй перакладчыка (такія з'явы менш паслядоўныя, гл. 1.3.4, 1.3.5).

1.3.1 Аднаслоўныя формы нямецкага імперфекту звычайна перадаюцца двухкампанентным славенскім перфектам, які складаецца з формаў дапаможнага дзеяслова і дзеепрыметніка, напрыкл.: *er in das Schiff* ***trat – ie*** *on uta zheln* ***ſtopel*** 13:2,

Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

fiel – ie palu / pallu 13:4, 5, 7, 8, 4:4, 7, 8; *es* ***bracht*** *keine Frucht –* ***nei*** *ſadu* ***perneslu*** 4:7, ***bracht*** *Frucht –* ***ie*** *ſad* ***perneslu*** 4:8, *er allein* ***war – ie*** *on* ***bil*** *ſam* 4:10, *die vmb jn* ***waren*** *– ty* ***ſo*** *okuli nega* ***bili*** 4:10. Але адзначаны і выпадак перадачы нямецкага імперфекту славенскім плюсквамперфектам – трохкампанентнай формай: *Da nu die Sonne* ***auffgieng*** *– kadar* ***ie*** *pag tu sonce* ***gori bilu prishlu*** 4: 6. Нямецкія перфектныя і прэзентныя формы заўжды захоўваюцца без змен колькасці кампанентаў, напрыкл.: *er* ***redet*** *– on … gouori* 13:3, *ſie es* ***gehört haben – ſo*** *oni to* ***slishali*** 4:15. Толькі ў адным выпадку адзначана адхіленне: *jre Augen* ***ſchlimmern*** *– nih ozhi* ***ſo ſaperte*** 13:15, абумоўленае заменай актыўнай канструкці пасіўнай паводле лацінскага перакладу: Vg, EB *oculos ſuos occluſerunt* / Vg *clauserunt*.

1.3.2 Адмоўе ў мінулым часе ў адз. л. зліваецца з формай дапаможнага дзеяслова славенскага перфекта: а) адпаведнае *nicht*, напрыкл.: *es* ***nicht*** *Wurtzel hatte –* ***nei*** *korena imeilu* 13:6, *korena* ***ne*** *imeilu* 4:6, *iſts* ***nicht*** *gegeben –* ***nei*** *danu* 13:11 (але ў мнж. л.: ***habens*** *nicht* ***geſehen*** *– ne* ***ſo uidili*** 13:17), у цяперашнім часе адмоўе з дзеясловамі *imeti* ў славенскай мове ўтварае сінтэтычную форму: *Wer aber* ***nicht hat*** *– kateri pag* ***nema*** 13:12; б) адпаведнае *kein(e, -es)*: *es bracht* ***keine*** *Frucht –* ***nei*** *ſadu* ***perneslu*** 4:7.

Адзінкавае адмоўе нямецкай мовы перад шэрагам аднародных дзеясловаў замяняецца ў славенскім перакладзе паўторам адмоўя перад кожным з такіх дзеясловаў: *Auff das ſie* ***nicht*** *der mal eins mit den Augen ſehen, vnd mit den Ohren hören, vnd mit dem Hertzen verſtehen, vnd ſich bekeren – De kei kadai ſozhima* ***ne*** *ugledaio, inu ſuusheſſi* ***ne*** *ſaslishio, inu ſteim ſerzom* ***ne*** *ſaſtopio, inu ſe* ***ne*** *preoberno* 13:15.

1.3.3 Фармальны дзейнік *es* пры дзеяслове ў няпэўна-асабовых сказах (кшталту *es gieng*) у перакладзе заўжды апускаецца, напрыкл.: ***es*** *gieng … aus – ie shal uun* 13:3, *ie vunkai shal* 4:3; *verwelcket* ***es*** *– ie uünilu* 13:6, 4:6; *ward* ***es*** *dürre – ie uſehlu* 13:6; *verdorret* ***es*** *– ie usehlu* 4:6, *werdet* ***es*** *nicht verſtehen – ne bote reſumeli* 13:14, ***es*** *verſamlet ſich – ſe sbere* 13:2, 4:2.

1.3.4 Даволі часта апускаецца асабовы займеннік пры дзеяслове, паказчыкам асобы ў перакладзе тады служыць дзеяслоўны канчатак, напрыкл.: *denn* ***ſie*** *verstehen es nicht – inu ne ſaſtopio* 13:13, *So ergert* ***er*** *ſich balde – taku ſe sdai ſmoti* 13:21, у некаторых выпадках – магчыма, пад лацінскім уплывам: *das* ***ſie*** *ſehen, … das* ***ſie*** *hören – kir uidio, … kir slishio* 13:16 (параўн.: Vg, EB *quia vident, … quia audiunt*, але: DB *kar vy vidite, … kar vy ſliſhite*), зрэдку апускаецца і няпэўны займеннік: *Wenn* ***jemand*** *das Wort höret – kir to Beſſedo poslusha* 13:20, 22, 23 (параўн. Vg, EB *hic eſt qui verbum* (EB *ſermonem* 13:23) *audit*).

1.3.5 Нямецкі артыкль зрэдку апускаецца, г. зн. не знаходзіць у перакладзе лексічнай адпаведнасці: *in* ***das*** *Steinichte – na kaminauu* 13:5 (але: *na* ***tu*** *kamenitouu* 4:5), *auff* ***das*** *Steinichte – na kaminouu* 13:20, *auffs Steinichte – na kamenetouu* 4:16; *vnter* ***die*** *Dörnen – vmei Terne* 4:7, (але: *umei* ***tu*** *terne* 13:7, 22, *v****tu*** *terne* 4:18).

Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

Аднак зрэдку Трубар устаўляе ў славенскім перакладзе «артыкль» там, дзе ў нямецкім тэксце ён адсутнічае: *durch Gleichniſſe – skuſi* ***te*** *perglihe* 13:10, 4:2 (але: *skuſi perglihe* 13:3, 4:11), *trübfal –* ***te*** *nadluge* 13:21, ***kakoua*** *nadluga* 4:17, *der betriegliche Reichthum – tu obnoriene* ***tiga*** *blaga* 4:19, *on Frucht – pres* ***tiga*** *ſadu* 4:19, *bringen Frucht – perneſſo* ***ta*** *ſad* 4:20, *viel ander Lüſte –* ***te*** *shele druſih rizhi* 4:19. Такая практыка мусіць адлюстроўваць, відаць, інтэрфераванае маўленне (Трубара і/ці яго асяроддзя).

1.3.6 Ад паслоўнага прынцыпу Трубар адступаў таксама ў шэрагу іншых выпадкаў, як: а) спецыфічныя нямецкія дзеяслоўныя канструкцыі (кшталту *zu* + inf.), якія ў Трубара заўжды перадаваліся аднакампанентным інфінітывам (гл. 3.1); б) нямецкія прыставачныя дзеясловы, якія часам перадаюцца словазлучэннем з дзеясловам і прыслоўем, або наадварот, адным дзеясловам (гл. 4.2); в) нямецкія складаныя назоўнікі, якія перадаюцца апісальнымі канструкцыямі (гл. 3.2); г) азначальны займеннік, які Трубар арыгінальна перадае словазлучэннем: *alles – vſe rizhi* 4:11 (Vg, EB *omnia*, DB *vſe*); д) некаторыя нямецкія складаныя злучнікі і злучальныя словы, напрыкл.: *die weil – kadar* 13:6, 4:6, *der mal – kei* 13:15, 4:12, *Auff das – de* 4:12x2, але: *die ſinds – ſo tudi ty* 4:16.

2 Парадак слоў

Парадак слоў у перакладзе часта адпавядае арыгіналу (г. зн. Лютару), асабліва ў іменных словазлучэннях, аднак нярэдка парадак парушаецца, асабліва адносна дзеясловаў. У адных выпадках гэта абумоўлена граматычнымі, сістэмнымі фактарамі (славенская мова ў адрозненне ад нямецкай дазваляе больш свабодны парадак слоў), у іншых, відаць, звязана са стылістычнымі стратэгіямі перакладчыка. У цэлым Трубар (у адрозненне ад Далмаціна) не вельмі клапаціўся пра захаванне парадку слоў свайго арыгіналу.

2.1 Дзеясловы і дзеяслоўныя формы (дзеепрыметнікі) часта (але не заўжды) ставяцца на канцы сказа, напрыкл.: *Warumb* ***redeſtu****...? – Sakai ...* ***gouorish****?* 13:10, *ich* ***ſage*** *euch – ieſt uom* ***poüim*** 13:17, *das ſelbige bald* ***auffnimpt*** *mit freuden – to iſto sdai ſüselem* ***gori uſame*** 13:20, ***nemen*** *ſie es bald ...* ***auff*** *– to iſto oni ſdaici ...* ***gori uſame*** 4:16, *Wenn* ***ſich*** *... vmbs worts willen* ***erhebet*** *– kadar... ſa uolo te beſſede* ***gori uſtane*** 4:17. Рэдкія прыклады супадзення месца ў сказе славенскага дзеяслова з нямецкім тэкстам (напрыкл.: *es nicht viel erden* ***hatte*** *–* ***nei*** *globoke ſemle* ***bilu / imeilu*** 13:5, 4:5) хутчэй выпадковыя: *es nicht tieffe erden* ***hatte*** *–* ***nei*** *globoke ſemle* ***imeilu*** 13:5, параўн.: ***nei imeilu*** *globoke ſemle* 4:5. Аднак вынас Трубарам дзеяслова на канец сказа праяўляецца толькі як тэндэнцыя і нідзе не вытрыманы паслядоўна, напрыкл.: *er* ***muſte*** *in ein Schiff* ***tretten*** *–* ***ie moral ſtopiti*** *ven zholn* 4:1, *die an dem Wege* ***find*** *– kir* ***ſo*** *natim Potu* 4:15, *So* ***kömpt*** *als bald der Satan – taku sdaici* ***pride*** *ta Hudizh* 4:15, *das in jr hertz* ***geſeet war*** *– katera* ***ie bila uſeiana*** *unih ſerceih* 4:15, *Die das wort* ***hören*** *– kir* ***poslushaio*** *to beſſedo* 4:18, *ty* ***poslushaio*** *to beſſedo* 4:20. Аб гэтым сведчаць і паралельныя месцы, дзе Трубар ставіць дзеяслоў адвольным

Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

чынам, напрыкл.: ***erſticket*** *das Wort – to Beſſedo* ***ſadushi*** 13:22, але: ***erſticken*** *das wort –* ***ſedushe*** *to Beſſedo* 4:19; *ſie es* ***gehört haben – ſo*** *oni to* ***slishali*** 4:15, але: *ſie das Wort* ***gehört haben – ſo*** *oni* ***slishali*** *to beſſedo* 4:16. Т. ч., пазіцыя дзеяслова ў перакладзе часта проста не вытрымліваецца. Канструкцыя *zu* + inf. звычайна застаецца на канцы сказа, як у нямецкім арыгінале (гл. 3.1), аднак часам Трубар пераносіць яе ў сярэдзіну: *Euch iſts gegeben das Geheimnis ...* ***zu wiſſen*** *– Võ ie danu* ***üiditi*** *to skriunoſt* 4:11.

2.2 Зваротная часціца ў перакладзе заўжды папярэднічае свайму дзеяслову, напрыкл.: *So ergert er* ***ſich*** *balde – taku* ***ſe*** *sdai ſmoti* 13:21, *ſo ergern ſie* ***ſich*** *als bald – taku* ***ſe*** *ſdaici sblaſnio* 4:17, што адпавядае нямецкаму тэксту толькі часткова (пры інверсійным парадку ў даданым сказе): *Wenn* ***ſich*** *... erhebet vmb des Worts willen – kadar ...* ***ſe*** *ſazhno ſa uolo te Beſſede* 13:21.

2.3 Даволі часта іменныя канструкцыі-актанты ўстаўляюцца ў: а) аналітычныя формы дзеяслова: *was da* ***geſeet iſt*** *in ſein hertz – kar* ***ie*** *unega ſercei* ***uſianu*** 13:19, *der an dem Wege* ***geſeet iſt*** *– kir* ***ie*** *poleg tiga potu* ***uſeian*** 13:19, *Der aber auff das Steinichte* ***geſeet iſt*** *– Inu tu kir* ***ie*** *na kaminouu* ***uſeianu*** 13:20 (але: *Hertz* ***iſt verſtockt*** *– ſerce* ***ie obterpnelu*** 13:15), *es* ***verſamlet ſich*** *viel Volks zu im –* ***ſe*** *k nemu* ***sbere*** *üliku ludi* 4:2 (але: *k nemu* ***ſe sbere*** *doſti ludi* 13:2); б) паміж дзейнікам і выказнікам, напрыкл.: ***er hat*** *nicht wurtzeln in jm –* ***on*** *uſebi ne* ***ima*** *korena* 13:21 (хаця: ***haben*** *keine wurtzel in jnen –* ***ne imaio*** *korena uſebi* 4:17). Не менш непаслядоўна расстаўляюцца актанты пры імёнах: ***jre*** *fünde* ***jnen – nim nih*** *grehe* 4:12.

2.4 Адмоўе заўжды ставіцца перад дзеясловам, напрыкл.: *haben* ***keine*** *wurtzel –* ***ne*** *imaio korena* 4:17, ***nicht*** *verſtehet –* ***ne*** *ſaſtopi* 13:19, *es* ***nicht*** *wurtzel hatte – korena* ***ne*** *imeilu* 4:6 (але: ***nei*** *korena* ***imeilu*** 13:6), у т. л. у пытальным сказе: ***Verſtehet*** *jr dieſe gleichniſſen* ***nicht****? –* ***Ne ſaſtopite*** *ui leto pergliho?* 4:13.

2.5 Даволі непаслядоўным і няўстойлівым у перакладзе было месца некаторых часціц, такіх як *pag* / *anpag* (гл. 5.6), або прыслоўяў, што ў спалучэнні з дзеясловам калькавалі нямецкія прыставачныя дзеясловы (гл. 4.2).

Толькі ў адным пасажу (4:10) адзначана змена частак сказа, здзейсненая, відаць, не без уплыву лацінскага тэксту: *fragten jn vmb dieſe Gleichniſſe, die vmb jn waren, ſampt den Zwelffen – ty ſo okuli nega bili ſred ſteimi duanaiſtimi, uprashaio nega ſa to Pergliho*, – Vg, EB *interrogaverunt eum hi qui circum illim* (Vg *circa eum*) *errant, cum duodecim, de parabolã* / Vg *parabolas*.

3 Перадача некаторых граматычных канструкцый арыгіналу

Шэраг граматычных канструкцый нямецкай мовы не маглі мець дакладных адпаведнікаў у славенскай мове, таму Трубар мусіў самастойна перадаваць падобныя з'явы. Да іх ліку адносяцца перадача канструкцыі *zu* + inf., прыназоўнікаў і генетыўных канструкцый.

Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

3.1 Адной з найбольш спецыфічных для славенскай мовы з'яўляецца канструкцыя *zu* + inf. Звычайна яна перадаецца аб'ектным ці прэдыкатыўным інфінітывам: *es gieng ein Seeman aus **zu ſeen** – Eden Seyüz ie shal uun **ſeyati*** 13:3, *en seuz ie vunkai shal **ſyati*** 4:3, *haben begert **zu ſehen** – ſo sheleli **uiditi*** 13:17, *er fieng … an **zu leren** – on ſazhne … **vuzhiti*** 4:1, *Euch iſts gegeben … **zu wiſſen** – Võ ie danu **üiditi*** 4:11. І толькі ў ідэаматычным выразе канструкцыя перакладзена аддзеяслоўным назоўнікам: *Wer ohren hat **zu hören**, der höre – Kateri ima ushefa **hposlushanu**, ta poſlushai* 13:9, *Du vushefa ima **hposlushanu**, ta poſlushai* 4:9, 4:23 (паслядоўнічае Трубару ва ўсіх трох выпадках і Далмацін: *Kateri ima uſhefsa h'poſluſhanju, ta poſluſhai*). Пераклад Трубара тут здзейснены пад уплывам перакладу Эразма: EB *qui(s) habet aures **ad audiendum**, audiat*, параўн.: Vg *Qui habet aures audiendi, audiat*.

3.2 Спецыфічны нямецкі генетыў з пасесівам перадаецца праз атрыбутыўнае словазлучэнне: *das Geheimnis des reichs **Gottes** – to skriunuſt tiga **Bohsyga*** [!] *kraleuſtua* 4:11 (больш літаральны Далмацін: *Boshjiga krajleſtva ſkrivnoſti*), *die weiſſagung **Iſaie** – tu **Eſayouu** prerokouane* 13:14. Адваротны выпадак – перадача атрыбутыўнага словазлучэння нямецкага арыгіналу праз генетыўную канструкцыю – назіраецца ў 4:19: *der betriegliche Reichthum* (таксама і Далмацін: *goluſſku blagu*) – *tu obnoriene tiga blaga*, яўна пад лацінскім уплывам: Vg, EB *deceptio divitiarum*.

Генетыўныя канструкцыі нямецкага тэксту звычайна Трубарам паслоўна захоўваюцца, напрыкл.: *die ſorge dieſer Welt – ta skerb tiga ſuita* 13:22, *te skerbi tiga ſuita* 4:19, таксама і пры інверсійным парадку: *dieſes volcks Hertz – letih ludi ſerce* 13:15 (DB *letiga Folka ſèrce*), *umb des Worts willen* 13:21, *vmbs worts willen* 4:17 – *ſa uolo te Beſſede* (DB *ſa Beſsede volo*, *ſa volo Beſsede*). Часам захоўваюцца і прыназоўнікавыя канструкцыі, эквівалентныя генетыўным: *das wort **von** dem Reich – to Beſſedo **od** tiga kraleuſtua* 13:19 (параўн.: Vg *verbum* / EB *ſermonem regni*), але: *auff dem lande **am** Meer – na krayu tiga moria* 4:1 (Vg *circa mare **super** terram*, EB *juxta mare **in** terrã*), магчыма, пад лацінскім уплывам: *die Vogel **vnter** dem Himel – te ptice tih nebes* 4:4 (Vg *volucres* (*caeli* – дадатак у некаторых кодэксах), EB *volucres cœli*).

3.3 Большасць прыназоўнікаў перадаецца таксама паслоўна і з захаваннем часцінамоўнай прыналежнасці, хаця не заўжды стабільна: *an* → *na* (прыклады гл. ніжэй); *auf* → *na* (13:8, 4:8, іншыя прыклады гл. таксама ніжэй), але: ***auff** ein gut Land – **ü**no dobro ſemlo* 4:20, яўна пад уплывам Эразма: ***in** terram bonam* (Vg *super*); *aus* → *is* (13:1); *durch* → *skuſi* (13:3, 10, 4:2, 11); *in* → *u* (13:2, 19, 21, 23, 4:1, 15, 4:17, іншыя прыклады гл. таксама ніжэй); *mit* → *s(u)* (прыклады гл. ніжэй); *on* → *pres* (4:19); *ſampt* → *ſred* (4:10); *vom* → *od* (13:12, 18, 19); *uber* → *na* (13:14); *vmb* → *ſa* (13:21, 4:10, 17), але: ***vmb** jn – **okuli** nega* 4:10, параўн.: Vg ***circa** eum*, EB ***circum** illim*); *vnter* → *umei* (13:7, 22, 4:7), але: ***vnter** die Dörnen – **v**tu Terne* 4:18 (у пасажы, што перакладаўся Трубарам не паводле Лютара); *zu* → *k* (13:2, 3, 10x2, 4:1, 2, 11).

Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

Паслоўны характар перакладу прыназоўнікаў пацвярджаецца і адлюстраваннем пры іх рознага кіравання нямецкага арыгіналу: *An dem ſelbigen tag*e – *Na ta iſti dan* 13:1, *am vſer – na tim bregu* 13:2; *an den Weg – na ta pot* 13:4, 4:4 і *an dem Weg – na tim Potu* 4:15, *an dem Wege – poleg tiga potu* 13:19, але: канструкцыі *am Meer* 4:1, *an das Meer* 13:1 перакладаюцца аднолькава: *poleg tiga Morya / moria* (DB *pèr Morji* 4:1x2, але *raven Morja* 13:1).

Аднак не назіраецца адрознення прыназоўнікаў нямецкага арыгіналу ў канструкцыі з субстантывам *kaminov* / *kamenitov*: *in das Steinichte – na kaminauu* 13:5, *na tu kamenitouu* 4:5, *auff das Steinichte – na kaminouu* 13:20, *auffs Steinichte – na kamenetouu* 4:16. Паказальна, што і Далмацін тут выкарыстоўвае толькі прыназоўнік *na*: *na kaminitu* 13:5, *na kamenitu* 13:20, 4:16, *na tu kaminitu* 4:5.

Пры перадачы прыназоўніка *mit* + Dat. Трубар літаральна паслядоўнічаў свайму нямецкаму арыгіналу, што магло прыводзіць да неўласцівых славянскай мове выразаў: *Mit den Ohren – steimi usheſi* 13:14, *mit ſehenden Augen – ſgledazhemi ozhima* 13:14, *mit den Augen … mit den Ohren … mit dem Hertzen – ſozhima … ſuusheſſi … ſteim ſerzom* 13:15; *mit freuden – füselem* 13:20, *füſelem* 4:16. Аднак у ідэаматычных канструкцыях Трубар перадаваў канструкцыю *mit* + Dat. дзеепрыметнікам пад уплывам лацінскага перакладу: *mit ſehenden Augen, … vnd mit hörenden Ohren – uideozh …, inu poslushaiozh* 13:13, 4:12 – Vg, EB *videntes …, & audientes*.

4 Калькаванне арыгіналу

Хаця структурна і лексічна нямецкая і славенская мовы ў значнай ступені непадобныя, у шэрагу выпадкаў можна адзначыць спробу Трубара калькаваць свой нямецкі арыгінал як у марфалогіі, так і ў мікрасінтаксісе. Такія спробы вынікалі як з паслоўнага прынцыпу перакладу, так і з інтэрфераванага маўлення самога Трубара.

4.1 У якасці агульнай заўвагі можна адзначыць граматычнае падабенства перакладу з арыгіналам(і), калі часціны мовы (назоўнік, прыметнік, дзеяслоў, прыслоўе, злучнік і часціца, нават артыкль) і асобныя граматычныя формы (лік, асоба, час) свайго арыгіналу Трубар імкнецца перадаваць тымі самімі часцінамі мовы ды граматычнымі формамі. Напрыклад: *SO höret nu jr dieſe Gleichnis von dem Seeman – Poslushaite tedai ui to pergliho od tiga Seuza* 13:18.

Адхіленні тут рэдкія і тычацца пераважна: а) распасаванне ў ліку, абумоўленае граматычнымі, сістэмнымі адрозненнямі паміж нямецкай і славенскай мовамі: *alles Volk* ***stund*** *– uſi ludi* ***ſo ſtali*** 4:1, або стылістычнымі мэтамі: *die ſorge dieſer Welt, vnd betrug des Reichthums,* ***erſticket*** *das Wort – ta skerb tiga ſuita tar golufya tiga blaga to Beſſedo* ***ſadushi*** 13:22, *die ſorge dieſer Welt, vnd der betriegliche Reichthum …* ***erſticken*** *das wort – te skerbi tiga ſuita, inu tu obnoriene tiga blaga* ***ſeduſhe*** *to beſſedo* 4:19 (формы Лютара і Эразма правільна адлюстроўваюць грэчаскі тэкст), або ўплывам лацінскага перакладу: ***die ſorge*** *dieſer Welt –* ***ta skerb*** *tiga ſuita* 13:22, але: ***te skerbi*** *tiga ſuita* 4:19, параўн.: Vg *sollicitudo saeculi*, EB: *cuta ſeculi huius* 13:22,

Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

Vg *aerumnae saeculi*, EB ***folicitudines*** *ſeculi hujus* 4:19; *ſondern* ***find*** *wetterwendiſch – temuzh* ***ſo*** *ne obſtuiezhi* 4:17, параўн.: Vg, EB *ſed temporarii* (Vg *temporales*) ***ſunt*** 4:17; б) замена імперфекту цяперашнім часам у пасажах з дзеясловамі маўлення (магчыма, у стылістычных мэтах): *die Jünger* ***tratten*** *zu jm, vnd* ***ſprachen*** *– ty Iogri* ***ſtopio*** *knim, inu* ***prauio*** 13:10, *Er antwortet, vnd* ***ſprach*** *– On odgouori inu* ***praui*** 13:11, *er* ***ſprach*** *zu jnen – on* ***praui*** *knim* 4:11 (у Далмаціна тут усюды перфект), в) змена актыўнай канструкцыі сказа на пасіўную: *Aber ſelig* ***find*** *ewer Augen – Anpag dobru* ***ie*** *uashim, ozhim* 13:16; г) ігнараванне зваротнага кампанента дзеяслова: *Jheſus …* ***ſatzte ſich*** *– Ieſus …* ***ſede*** 13:1, відавочна, пад уплывам Эразма: EB *Jeſus …* ***ſedit***, параўн.: Vg *Iesus … sedebat*, ***ſich … erhebet – gori uſtane*** 4:17, хаця зваротнасць дзеясловаў усюды звычайна захоўваецца; е) выражэнне зваротнасці: *wiederferet – ſe gode* 4:11 (гл. 1.1.2), *geſeet wird – ſe … ſeye* 4:15 (гл. 5.2.4).

4.2 Найбольш паказальным прыкладам калькавання нямецкага тэксту можа служыць нямецкі прыставачны дзеяслоў, аддзяляльная прыстаўка якога магла ператварацца ў прыслоўе і апынацца на дыстанцыі. Такі лад нямецкай мовы імкнецца адлюстраваць у сваім перакладзе і Трубар: *es* ***gieng*** *ein Seeman* ***aus*** *– Eden Seyüz ie* ***shal uun*** 13:3, *en seuz ie* ***vunkai shal*** 4:3, *Wenn jemand …* ***auffnimpt*** *– ie leta kir …* ***gori uſame*** 13:20, *die Dörnen* ***wuchſen auff / empor*** *– tu terne ie* ***gori ſraslu / gori sraslu*** 13:7, 4:7, *die Sonne* ***auffgieng*** *– ie … tu sonce* ***gori bilu prishlu*** 4: 6, *die da* ***zunam*** *vnd wuchs – kateri ie* ***gori iemal*** *inu raſſel* 4:8, ***nemen*** *ſie es bald …* ***auff*** *– to iſto oni ſdaici …* ***gori uſame*** 4:16, ***gehen hinein – prido noter*** 4:19, ***nemens an – gori vſameio*** 4:20.

У некаторых выпадках славенскі дзеяслоў з прыслоўным кампанентам выступае на тым месцы, дзе ў Лютара такі дзеяслоў адсутнічае: ***ſich … erhebet – gori uſtane*** 4:17 (мусіць адпавядаць *aufstehen*), у іншым месцы TT 1557 і TE 1555 гэты дзеяслоў перакладецца інакш: ***ſe ſazhno*** 13:21, параўн. у абодвух выпадках DB *pride*.

У іншых выпадках нямецкі прыставачны дзеяслоў перадаецца адпаведнікам без прыслоўя – прыставачным дзеясловам: *die Vogel …* ***fraſſens auff*** *– te ptice …* ***ſo*** *ie* ***pozobale / poſobale*** 13:4, 4:4, ***gieng … auff – ie … uſeshlu / uſashlu*** 13:5, 4:5, *Er* ***antwortet*** *– On* ***odgouori*** 13:11, ***verſtehet*** *es – to* ***ſaſtopi*** 13:23, *der Arge …* ***reiſſet*** *es* ***hin*** *– ta Hudi …* ***isdere*** *tu* 13:19, *er* ***fieng*** *…* ***an*** *– on* ***ſazhne*** 4:1, ***Höret zu – Poslushaite*** 4:3 (але: *SO* ***höret*** *nu –* ***Poslushaite*** *tedai* 13:18).

4.3 Нямецкі складаны назоўнік толькі аднойчы перададзены словазлучэннем: *des Himelreichs – tiga nebeskiga kraleuſtua* 13:11 (Vg, EB *regni caelorum*), у іншых выпадках складаныя назоўнікі перадаецца адным словам і звычайна не калькуюцца: *weiſſagung – prerokouane* 13:14 (параўн. Vg, EB *prophetia*). Не адзначана калькавання і суфіксальных назоўнікаў: *vnd* ***betrug*** *des* ***Reichthums*** *– tar* ***golufya*** *tiga* ***blaga*** 13:22 (параўн.: Vg *et fallacia divitiarum*, EB *deceptióqü divitarium*), *der betriegliche* ***Reichthum*** *– tu obnoriene tiga* ***blaga*** 4:19, у некаторых выпадках супадзенне марфемнай структуры можа быць выпадковым, параўн.: *trübſal und / oder* ***verfolgung*** *– ta nadluge inu* ***preganene*** 13:21, *kakoua nadluga oli* ***preganene*** 4:17.

Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

Інакшы прыклад – калькаванне лацінскага слова (?) – можна назіраць у 4:2, дзе мае месца пасэнсавы, а не паслоўны пераклад дзеяслова *predigen* (< *praedicare*): *er* ***predigt*** – *on* ***ie … rizhi uuzhil***, хаця лексічная магчымасць для паслоўнага перакладу існавала, параўн.: *in ſeiner* ***predigt*** – *vti nega* ***pridigi*** 4:2 (DB *on je … predigoval … v' ſvoji Predigi*).

5 Лексічная стабільнасць унутры самога перакладу

Перадача на працягу тэксту элементаў арыгіналу аднолькавымі элементамі перакладу характарызуе не толькі стабільнасць перакладу, але і некаторыя тэхнічныя прыёмы і псіхалінгвістычныя механізмы перакладчыка. У цэлым працу Трубара можна ахарактарызаваць як у пэўнай меры кантэкстуальны і нефармальны пераклад.

5.1 Дастаткова стабільна перакладаюцца назоўнікі і прыметнікі. Бадай што адзінае выключэнне ўтварае нямецкі назоўнік *Volk*, які перадаецца як *ludi*, але аднойчы як *folk*, хаця побач выступае і пераклад *ludi*: *viel Volks – doſti ludi* 13:2, *üliku lud*i 4:2, *alles Volck – uſi ludi* 4:2, *uus folk* 13:2 (у Вульгаце і ў Эразма на гэтых месцах адзначана толькі *turba*). Паказальна, што германізм з'явіўся менавіта ў выданні 1557 г., у ТТ 1555 тут выступае *vſi Ludie* 13:2.

Некаторую складанасць у Трубара (як і ў Далмаціна) выклікала перадача прыметніка *wetterwendisch*, які быў перададзены апісальна: *ſondern iſt* ***wetterwendiſch*** – *temuzh* ***on kratig zhas obſtoi*** 13:21, *temuzh* ***ſo ne obſtuiezhi*** 4:17, насуперак даволі яснаму лацінскаму перакладу: Vg *est temporales*, EB *ſed temporarius eſt* 13:21; Vg, EB *ſed temporarii* (Vg *temporales*) ***ſunt*** 4:17.

5.2 Прыкметная непаслядоўнасць адзначаецца для дзеясловаў (і ўтвораных ад іх дзеепрыметнікаў). Частаўжывальныя (і ў маўленні, і ў евангельскі тэксце) дзеясловы маюць рэгулярныя адпаведнасці, тады як рэдкаўжывальныя характарызуюцца значнай варыятыўнасцю. Відаць, Трубар перакладаў паводле памяці і з улікам кантэксту, а не паводле нейкіх фармальных адпаведнасцяў (напрыклад, з выкарыстаннем дапаможнага слоўнічка).

5.2.1 Спецыфічныя для тэматыкі ўрыўкаў дзеясловы, звязаныя з раслінаводствам (*seen*, *aufgehen*, *aufwachsen*, *bringen / tragen* (*Frucht*) і інш.), у цэлым маюць стабільныя пераклады у розных месцах тэксту, нестабільнасць абумоўленая хутчэй уплывам іншых крыніц.

Пры перадачы дзеяслова са значэннем 'сеяць' Лютар усюды выкарыстоўвае адзін дзеяслоў *seen*, што адпавядае Вульгаце, дзе выступае *seminare*. Аднак Эразм у прыпавесці і напачатку тлумачэння выкарыстоўваў *seminare* (13:3, 4, 18, 19x2, 4:3, 4, 14, 15x2), а напрыканцы тлумачэння ўжываў словазлучэнне *semen excipere* (13:20, 22, 23, 4:15, 16, 18, 20). Трубар у Мц. цалкам, а ў Мк. часткова (у прыпавесці і напачатку тлумачэння) гэты дзеяслоў перадаваў паводле Вульгаты і Лютара як *(u)sejati* (13:3, 4, 19x2, 20, 22, 23, 4:3, 4, 14, 15x2).[5] Аднак далей у Мк. (напрыканцы тлумачэння) Трубар звяртаецца да Эразма і перадае гэтае месца

Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

праз словазлучэнне *seme vzeti*: *die … geſeet ſind – kir tu ſeime … vſamo* 4:16, *kateri tu ſeime … vſameio* 4:18, *kir vſameio tu ſeime* 4:20 – ЕВ: *ſemen excipiunt* 4:16, 18, *ſemen exceperunt* 4:20, параўн.: Vg *qui … seminatum* 4:16, *qui … seminatur* 4:18, *qui … seminati sunt* 4:20.

Дзеяслоў *aufgehen* (пра расліны ці сонца) перадаецца стабільна як *vziti* ў кантэксце пра расліны (13:5, 4:5), аднак у кантэксце пра сонца ён зазнае варыятыўнасць *vziti ~ gori priti*: *die Sonne* ***auffgieng*** *– ie … to ſonce* ***uſeshlu*** 13:6, але: *ie … tu sonce* ***gori*** *bilu* ***prishlu*** 4:6. Сінанімічны дзеяслоў *aufwachsen* стабільна перакладаецца як *gori zrasti* (13:7, 4:7).

У дзеяслоўнай канструкцыі *bringen Frucht*, якая стабільна перакладаецца як *pernesti sad* (13:23, 4:7, 8, 20), адзначана непаслядоўнасць: *bringet nicht Frucht – pres ſada rata* 13:22 (DB: *ne pèrneſse ſadu*), Vg *sine fructu efficitur*, ЕВ *infrugiter redditur*. Пераклад сінанімічнай канструкцыі *trag Frucht* як *ie dalu ſad* 13:8 здзейснены, відаць, пад уплывам Вульгаты: *dabant fructum*, але не Эразма: *dederunt fructum*, аднак інакш: *etlicher* ***tregt*** *hundert feltig –* ***ſturi*** *nekateru ſamoſtu* 13:23, параўн.: Vg *facit aliud quidem centum*, ЕВ *facit alius quidem centuplum*.

Стабільна перакладаюцца дзеясловы *verwelken* – як *uveniti* (13:6, 4:6), *ersticken* – як *zadušiti* (13:7, 22, 4:7, 19), *auffressen* – як *pozobati* (13:4, 4:4).

5.2.2 Група дзеясловаў разумення і ментальных працэсаў (*verstehen*, *vernehmen*, *sehen*, *(zu)hören*, *ergern sich* і інш.), даволі шырока прадстаўленая ў тлумачэнні прыпавесці, мае прыкметную нестабільнасць у перакладзе.

Дзеяслоў *verstehen* звычайна перадаецца як *ſastopati / ſastopiti* (13:13, 15, 19, 23, 4:12, 13x2), але аднойчы Трубар дапушчае адхіленне: *werdet es nicht* ***verstehen*** *– ne bote* ***reſumeli*** 13:14. Сінанамічны дзеяслоў *vernehmen* перадаецца то як *znati*: *jr …* ***vernemet*** *– vi* ***ſnate*** 13:11, то як *videti*: *werdet es nicht* ***vernemen*** *– ne bote* ***uidili*** 13:14, у апошнім выпадку пад уплывам, відаць, Эразма: *non cernetis*, а не Вульгаты: *non videbitis*.

Дзеяслоў *sehen* звычайна перакладаецца як *videti / viditi* (13:13x2, 16, 17x3, 4:12x2), але зрэдку Трубар яго перадае як *(u)gledeti* / *(u)gledati*: *mit* ***ſehenden*** *Augen werdet jr* ***ſehen*** *–* ***ſgledazhemi*** *ozhima bote* ***gledali*** 13:14, *Auff das ſie nicht der mal eins mit den Augen* ***ſehen*** *– De kei kadai ſozhima ne* ***ugledaio*** 13:15; аднойчы дзеясловам *ugledati* Трубар пераклаў *erkennen*: *ſie es mit ſehenden Augen ſehen, vnd doch nicht* ***erkennen*** *– de uideozh uidio, inu ne* ***ugledaio*** 4:12 (пад уплывам Вульгаты: *non videant,* насуперак Эразму: *non cernant*).

Шырокая словаўтваральная варыятыўнасць назіраецца пры перадачы дзеяслова *(zu)hören*. Часцей за ўсё *hören* перадаецца як *poslušati* (13:13, 18, 19, 20, 22, 23, 4:9, 12x2, 18, 20, 23), таксама і *zuhören* (4:3), крыху радзей – як *slišati* (13:13, 14, 15, 16, 17x2, 4:15, 16), зрэдку – аддзеяслоўным назоўнікам: *zu hören – hposlushanu* 13:9, 4:9, 23 (пад уплывам Эразма, гл. 3.1), нарэшце, аднойчы выступае сінонім *zaslišati*: *mit den Ohren* ***hören*** *–* ***ſuusheſſi*** *ne* ***ſaslishio*** 13:15.

[5] Сюды таксама аднесены выпадак з аддзеяслоўным назоўнікам *v tim ſeyanu* 4:4 пры *in dem er ſeet* (гл. 5.5).

Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

Можна адзначыць таксама варыятыўнасць перакладу дзеяслова *ergern sich* – то як *zmotiti se*: *So* ***ergert*** *er* ***ſich*** *balde – taku* ***ſe*** *sdai* ***ſmoti*** 13:21, то як *zblazniti se*: *ſo* ***ergern*** *ſie* ***ſich*** *als bald – taku* ***ſe*** *ſdaici* ***sblaſnio*** 4:17 (DB *taku ſe on sdajci pohujſha*; *taku ſe ony hitru pohuiſhajo*).

5.2.3 Група дзеясловаў маўлення характарызуецца стабільнасцю, відавочна, з прычыны сваёй частаўжывальнасці. Так, дзеяслоў *reden* рэгулярна перакладаецца як *govoriti* (13:3, 10, 13), дзеяслоў *sprechen* рэгулярна перакладаецца як *praviti* (13:3, 10, 11, 4:2, 9, 11, 13). Аднак ужо дзеяслоў *sagen* перакладаецца то як *praviti*: *die da* ***ſagt*** *– kir* ***praui*** 13:14, то як *povedeti*: *ich* ***ſage*** *euch – ieſt uom* ***poüim*** 13:17.

5.2.4 Нямецкія службовыя дзеясловы, прадстаўленыя ва ўрыўках (*sein*, *haben*, *werden*), перакладаюцца даволі стабільна, а большасць адхіленняў тлумачыцца сістэмнымі прычынамі.

Дзеяслоў *sein* у службовай ці самастойнай функцыі перадаецца як *biti*, напрыкл.: *das in jr hertz geſeet* ***war*** *– katera* ***ie bila*** *uſeiana unih ſerceih* 4:15.

Дзеяслоў *haben* у службовай ці самастойнай функцыі звычайна перадаецца як *imeti*, напрыкл.: *Denn wer da* ***hat*** *…, Wer aber nicht* ***hat*** *– Sakai kateri* ***ima*** *…, kateri pag* ***nema*** 13:12. Адзінае адхіленне складае пераклад пасажу ў 13:5: *es nicht viel Erden* ***hatte*** *– nei üliku ſemle* ***bilu*** (таксама TT 1555, параўн.: TT 1557 *nei üliku ſemle* ***imeilu*** 4:5, *es nicht tieffe erden* ***hatte*** *– nei globoke ſemle* ***imeilu*** 13:5, *nei imeilu globoke ſemle* 4:5), наўрад ці пад уплывам лацінскіх крыніц – у Эразма і ў Вульгаце ва ўсіх гэтых выпадках стаіць *habeo*. Выключэнне таксама складае нямецкі перфект, які ў перакладзе замяняецца славенскім перфектам з формай дзеяслова *biti*: ***haben begert*** *…* ***habens*** *nicht* ***geſehen*** *…* ***habens*** *nicht* ***gehöret*** *–* ***ſo sheleli*** *… ne* ***ſo uideli*** *… ne* ***ſo sliſshali*** 13:17; *ſie es* ***gehört haben*** *–* ***ſo*** *oni to* ***slishali*** 4:15, *ſie das wort* ***gehört haben*** *–* ***ſo*** *oni* ***slishali*** *to beſſedo* 4:16.

Дзеяслоў *werden* у спалучэнні з інфінітывам звычайна перадаецца як *bode / bodo, bote* для выражэння формы будучага часу, напрыкл.: ***werdet*** *jr hören, vnd* ***werdet*** *es nicht verſtehen, vnd …* ***werdet*** *jr ſehen, vnd* ***werdet*** *es nicht vernemen –* ***bote*** *ui slishali, inu ne* ***bote*** *reſumeli, inu …* ***bote*** *gledali, tar ne* ***bote*** *uidili* 13:14 (гл. таксама 13:12, 14, 4:12). Аднак у іншай функцыі дзеяслоў *werden* перадаецца ўжо інакш: *Wo das Wort* ***geſeet wird*** *– kadar* ***ſe*** *ta Beſſeda* ***ſeye*** 4:15. У сваю чаргу, з дапамогай формаў *bodo, bote* перакладаюцца і іншыя дзеясловы: *das er die fülle* ***habe*** (форма ўмоўнага ладу) *– de* ***bode*** *obilnu* ***imel*** 13:12, DB *de bo obilnu imèl*; *Wie* ***wolt*** *jr … alle verſtehen? – Koku* ***bote*** *… vi … vſe ſaſtopili?* 4:13.

5.3 Непаслядоўнасць у перакладзе займеннікаў характэрная для няпэўнага займенніка. У тэксце прыпавесці для Мц. уласціва перадача *etlichs* як *nekateru* / *nekoteru* (13:5, 7, 8x4, 23), Vg, EB *alia* / *aliud* (EB *alius* 13:23x3), аднак ужо ў Мк. адбываецца змена. Напачатку прыпавесці ўжываецца ранейшая форма *neketeru* 4:4, 5, 7, 8 (у крыху адрознай арфаграфіі), Vg, EB *aliud* (Vg *alia* 4:8), аднак у тымсамым вершы 4:8x3 з'яўляецца новы эквівалент *enu*, які адпавядае лацінскаму перакладу Vg, EB *unum* і выкарыстоўваецца і надалей (4:20x3) – там у Лютара адпавядае

Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

etlicher, Vg *unum*, EB *aliud*. Ужыванне формы *enu* у 4:8x3, 20x3 як адпаведнік Vg *unum* (насуперак Эразмавага перакладу *aliud* 4:20x3 сведчыць, што Трубар выкарыстоўваў Вульгату і пры працы над TT 1557, а не толькі пераклад Эразма.

5.4 Пераклад прыслоўяў у цэлым нестабільны, напрыкл.:

bald – sdaici / ſdaici 4:5, 15, 16x2, *balde – sdai* 13:21, але: *bald – skorai* 13:5;

da – tu 13:19, *tukai* 4:4, але часам увогуле без перакладу: *die* ***da*** *ſagt – kir praui* 13:14, відаць, пад уплывам Эразма: *quæ dicit*, параўн.: Vg *dicens*; *die* ***da*** *zunam – kateri ie gori iemal* 4:8;

viel – üliku ~ doſti: *viel Volks – doſti ludi* 13:2, *üliku ludi* 4:1 (Vg, EB *turba multa*, *turbæ multæ*), параўн.: *viel – üliku* 13:5, *mancherley – üliku* 13:3, *lang – doſti* 4:2.

5.5 Асаблівую нестабільнасць выяўляе перадача злучнікаў. Тут перакладчык імкнуўся перадаваць злучнік злучнікам, аднак з прычыны іх шматфункцыянальнасці ён шырока вар'іраваў свае славенскія адпаведнікі.

Так, злучнік *und* амаль заўжды перадаецца як *inu*, аднак у некаторых кантэкстах Трубар перадаваў *und* як *tar* 13:14, 22, *kir* 13:23. У цэлым пераклад многіх злучнікаў даволі нестабільны, напрыкл.:

da – Inu 13:4, *kir* 4:5, *kadar* 4:10;

denn – potle 13:23, *sakai* 13:12, *inu* 13:13, параўн.: *warumb – sakai* 13:10.

Нярэдка нестабільнасць у перадачы злучнікаў была выклікана ўплывам лацінскага перакладу: *in dem er ſeet – utim kadar on ſeye* 13:4 (параўн.: Vg *dum seminat*, EB *quum ſeminaret*), але: *vtim ſeyanu* 4:4 (параўн.: Vg *dum seminat*, EB *inter ſeminandum* 4:4).

5.6 Даволі нестабільным быў пераклад часціц. Так, часціца *so* магла апускацца: *SO höret nu – Poslushaite tedai* 13:18 (параўн.: TE 1555 *pag poslushaite*), але не ў складзе злучніка: *Wenn … So kompt – kadar … taku pride* 13:19. Напрыклад, частаўжывальная часціца *aber* звычайна перакладалася як *pag*, радзей *anpag*: *Als* ***aber*** *– kadar …* ***pag*** 13:6, *Dieſes* ***aber*** *– letim* ***pag*** 13:11, *Wer* ***aber*** *– kateri* ***pag*** 13:12, *Der* ***aber*** *– Letu* ***pag*** *kir* 13:22, 23, *Dieſe ſinds* ***aber*** *– Lety ſo* ***pag*** 4:15; ***Aber*** *ſelig –* ***Anpag*** *dobru* 13:16, *Denen* ***aber*** *–* ***anpag*** 4:11, але зрэдку набывала іншы пераклад: *Der* ***aber*** *–* ***Inu*** *tu kir* 13:20, ***Aber*** *er –* ***Oli****, on* 13:21 (параўн.: *oder – oli* 4:17), або зусім заставалася неперакладзенай (элімінавалася): *etlicher* ***aber*** *ſechzigfeltig – nekateru ſamo shesdeſett* 13:23. У сваю чаргу, нярэдка Трубар самастойна ўводзіў часціцу *pag* у свай пераклад, без наяўнасці ў арыгінале адпаведніка *aber*: *Etlichs – Nekateru* ***pag*** 13:5, 7, 8, 4:5.

6 Рэдагаванне Трубарам уласнага перакладу

Параўнанне выданняў 1555, 1557 і 1581–82 гг. паказала, што Трубар свой ранейшы пераклад TT 1555 крыху адрэдагаваў, унёсшы ў TT 1557 неістотныя, але паўсюдныя змены пераважна стылістычнага характару, тады як TT 1581–82 без істотных змен перадае ранейшы тэкст 1557 г.

Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

6.1 Рэдагаванне ранейшага перакладу 1555 г. у цэлым насіла стылістычны характар. Трубар удакладняў свой пераклад, у большасці выпадкаў – за кошт набліжэння да Лютаравага ці лацінскага тэксту.

Набліжэнне да нямецкага перакладу заўважана ў змене часавых формаў дзеясловаў – яны прыводзяцца ў адпаведнасць з тэкстам Лютара: *ſe ie knemu sbralu → ſe knemu sbere* 13:2, параўн.: LB 1546 *es verſamlet ſich ... zu jm*; *gre vun → ie shal uun* 13:3, параўн.: LB 1546 *es gieng ... aus*. Аналагічны характар мае ўстаўка асабовага займеніка: *bote slishali → bote **ui** slishali* 13:14, параўн.: LB 1546 *werdet **jr** höret*. Таксама набліжэнне да перакладу Лютара адзначана ў замене *Eden kir ſeye → Eden Seyüz* 13:3, параўн.: LB 1546 *ein Seeman*, тады як Vg, EB *qui ſemina(ba)t*.

У іншым выпадку адзначаецца набліжэнне Трубара да Вульгаты: *Vom ie danu → **Sakai** uom ie danu* 13:11 (гл. 1.1.3). Магчыма, пад лацінскім уплывам здзейснены замена лексемы *kraj* на *breg* (*na tim kraiu → na tim bregu* 13:2, LB 1546 *am ufer*, Vg, EB *in lit(t)ore*), а таксама ўдакладненне злучнікаў і злучальных слоў: *Leta pag kir ... Ie ta, kadar … → Inu tu kir ... ie leta kir …* 13:20 (LB 1546 *Der aber ..., der iſts, Wenn…*, Vg, EB (EB *At*) *qui ..., hic eſt qui…*), аналагічна: *Ie ta, kadar du… → Ie ta kir…* 13:22, 23 (LB 1546 *der iſts, Wenn…*, Vg, EB *hic eſt qui…*).

У астатніх выпадках мае месца рэдагаванне славенскага перакладу, не абумоўленае ўплывам нямецкай ці лацінскай версіі: замена лексемы *krat* на *samo* (*ſtucrat → ſamo ſtu*, *shedeſſetcrat → ſamo shedeſſet*, *trideſſetcrat → ſamo trideſſet* 13:8, аналагічна: *ſamoſtucrat → ſamo ſtu*, *shesdeſetcrat → ſamo shesdeſett*, *trideſetcrat → ſamo trideſſet* 13:23); удакладненне злучальнага слова: *kar → tukar* 13:12 і граматычнай канструкцыі сказа: *Leta ...ie ... vſeiana → Letu ... ie ... uſeianu* 13:22, 23. Адзначана таксама змена парадку слоў разам з заменай прыслоўя: *Vi **pag** poslushaite to pergliho → Poslushaite **tedai** ui to pergliho* 13:18 (LB 1546 *SO höret nu jr dieſe Gleichnis*, Vg , EB *Vos igitur* (Vg *ergo*) *audite parabolam*); выпраўлены пропуск ранейшага выдання: *inu ſaſtopio → inu ne ſaſtopio* 13:13.

6.2 У ТТ 1581–82 маюцца некаторыя адхіленні ад тэксту ТТ 1557, абумоўленыя не столькі пэўнай рэдактурай, колькі няўважлівасцю зэцара і карэктара. Відаць, аб гэтым сведчаць асобныя адрозненні ў напісанні, напрыклад.: *na m**o**riu ſedel → na m**u**riu ſedel* 4:1, ***i**e sdaici uſashlu → **ſ**e ſdaici vſashlu* 4:5, *a**n**pag → A**m**pag* 4:11, *nim nih greh**e** – nim nih greih**i*** 4:12. Таму рэдкія адхіленні ад тэксту ТТ 1557 можна тлумачыць не столькі свядомай рэдактурай, колькі памылкай выдаўцоў. Так, у пасажы *Inu vti nega pridigi praui **knim** → Inu vti nega Pridigi praui* 4:2 – выкінуты не толькі асабовы займеннік *on* (што можа адпавядаць стылю Трубара, гл. 1.3.4), але актант *k nim*, які маецца як у Лютара (*zu jnen*), так і ў лацінскім тэксце (Vg, EB *illis*).

7 Высновы

У сваёй працы Трубар абапіраўся пераважна на нямецкі пераклад Лютара, адхіляючыся ад яго ў дэталях, галоўным чынам, пад уплывам лацінскага перакладу Эразма Ратэрдамскага і Вульгаты. Другой крыніцай адхіленняў (пераважна

Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

ў мікрасінтаксісе) былі сістэмныя, структурныя разыходжанні паміж нямецкай і славенскай мовамі. Асноўным прынцыпам перакладу для Трубара амаль заўжды заставаўся паслоўны. Самастойнасць Трубара ў перакладзе назіраецца хіба што ў выбары месца для дзеяслова ў сказе, часам – у парадку слоў, а таксама ў «пераключэнні» з нямецкага тэксту на лацінскі. У той жа час пераклад Трубара можна ахарактарызаваць як паслоўны і дакладны, хаця і не вельмі літаральны – літаральнасць яго меншая, напрыклад, за пераклад Далмаціна. Пераклад дзеясловаў і прыслоўяў, а таксама злучнікаў і часціц, частых у евангельскім дыскурсе, у Трубара не вельмі стабільны. Даволі часта перакладчык перадаваў прэдыкатыўныя часткі сказаў кіруючыся ўласнай моўнай кампетэнцыяй, а не нейкімі фармальнымі адпаведнасцямі. Гэта сведчыць, што ён добра ведаў славенскую мову і няблага валодаў нямецкай і таксама лацінскай.

Крыніцы

DB = Юрый Далмацін. *Biblia, tu ie, vse svetu pismu, stariga inu Noviga Testamenta*. Вітэнберг, 1584 (паводле факсімільнага выдання: Ljubljana; München, 1968).

EB = Лацінскі Новы Запавет у перакладзе Эразма Ратэрдамскага, паводле выдання: *Novvm testamentum per D. Erasmvm Roterodamum noviſſime recognitum*. Parisiis, 1542.

LB 1546 = Нямецкі Новы Запавет у перакладзе Марціна Лютара, паводле выдання: Martin Luthers: *Werke kritiſche Geſamtausgabe* [*Die Deutſche Bibel*]. Weimar, 1929. Bd. 6.

TE 1555 = Трубар Прымаж. *Ta evangeli svetiga Matevsha*. Цюбінген.

TT 1557 = Трубар Прымаж. *Ta pervi deil tiga noviga testamenta*. Цюбінген.

TT 1581–82 = Трубар Прымаж. *Ta celi Novi Testament*. Цюбінген.

Vg = Лацінская Вульгата паводле выдання: *Novum Testamentum Graece et Latine* / Ed. E. Nestle, K. Aland et al. Stuttgart, 1991.

Літаратура

Kozma Ahačič, 2007: *Zgodovina misli o jeziku in književnosti na Slovenskem: Protestantizem*. Ljubljana, 2007 (Linguistica et philologica 18).

Anton Breznik, 1917: *Literarna tradicija v »Evangelijih in listih«* [1. del]. Dom in svet: Književnosti; Umetnosti. 30. 170–174.

Ivan Grafenaür, 1914: *O Trubarjevem prevodu evangelijev*. Dom in svet: Književnosti; Umetnosti. 27. 297–303.

Fran Ilešič, 1908: *Primož Trubar in njegova doba*. Trubarjev zbornik. V Ljubljani. V–XXXII.

Jernej Kopitar, 1808: *Grammatik der Slaviſchen Sprache in Krain, Kärnten und Steyermark*. Laibach.

Jože Koruza, 1984. Pomen protestantizma za nastanek in razvoj slovenske književnosti. *XX. seminar slovenskega jezika, literature in kulture*. Ljubljana. 103–121.

France Rozman, 1986: Kako je Trubar prevajal Sveto pismo Nove zaveze? *Bogoslovni vestnik* 46/3. 227–245.

Elisabeth Seitz, 1998. *Primus Truber – Schöpfer der slovenischen Schriftsprache?* München. (Slavistische Beiträge 363).

Jože Toporišič, 1987: Zgodovinska perspektiva nemčevanja pri Trubarju. *XXIII. seminar slovenskega jezika, literature in kulture*. Ljubljana. 5–18.

Slavistična revija (https://srl.si) je ponujena pod licenco
Creative Commons, priznanje avtorstva 4.0 international.
URL https://srl.si/sql_pdf/SRL_2008-2009_Trubarjevaštevilka_25.pdf |
DOST. 10/02/26 9.16

Summary

Trubar's translations of Luther were consistent for the most part, yet he did from time to time rely on the Latin translation of Erasmus of Rotterdam and the Vulgata. The main principle of Trubar's translation was the word-by-word principle that was limited by grammatical differences between German and Slovenian and some other stylistic strategies. The word order is often the same as that of the original but is nevertheless dü to systemic and stylistic reasons different as far as verbs and certain particles are concerned. In some cases Trubar adopted the lexis and the syntax of the original. The translation of nouns is very stable whereas the translation of verbs, adverbs, conjunctions and particles in various parts of the text is less consistent. The translator transferred verbal phrases on the basis of his own linguistic capabilities, which proves that he had a good grasp of Slovenian, German and Latin. Trubar's translation can be seen as consistent, yet not entirely literal (as is the case with Dalmatin's translation).